

Раздзел VII

# КРАІНЫ АЗІІ, АФРЫКІ І ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## § 39. Распад каланіяльнай сістэмы

*Як паўплывала на палітычнае развіццё каланіяльных і залежных краін Другая сусветная вайна?*

Пасля Другой сусветнай вайны рэзка змяніліся суадносіны сіл на міжнароднай арэне. Уплыў еўрапейскіх краін зменшыўся, у той час як ЗША і СССР сталі звышдзяржавамі. Але самай істотнай зменай быў крах каланіяльнай сістэмы і з'яўленне новых незалежных дзяржаў.

**Атрыманне незалежнасці.** Працэс вызвалення народаў Азіі і Афрыкі ад каланіяльнага панавання пасля Другой сусветнай вайны ўвайшоў у гісторыю пад назвай ***«дэкаланізацыя»***. Яе можна ўмоўна падзяліць на тры этапы.

*Першы этап (1945 — сярэдзіна 1950-х гг.)* — незалежнасць атрымалі больш за дзесяць дзяржаў Азіі і Афрыкі.

*Другі этап (сярэдзіна 1950-х — сярэдзіна 1960-х гг.)* — вызваленне ад каланіяльнай залежнасці значнай часткі Афрыканскага кантынента. У 1960 г. Генеральная Асамблея ААН прыняла Дэкларацыю «Аб наданні незалежнасці каланіяльным краінам і народам». З таго часу дэкаланізацыя была пастаўлена на міжнародны кантроль.

*Трэці этап (1975—1990-я гг.)* характарызаваўся крушэннем партугальскай каланіяльнай імперыі, у выніку чаго тэрыторыя Афрыкі стала вольнай ад каланіялізму.

**Краіны, якія сталі на шлях развіцця.** Новыя дзяржавы Азіі і Афрыкі, а таксама краіны Лацінскай Амерыкі пачалі называць ***краінамі, якія сталі на шлях развіцця***, або

Правообладатель Издательский центр БГУ

***краінамі «трэцяга свету»***. Тэрмін «трэці свет» выкарыстоўваўся для абазначэння дзяржаў з менш развітымі тэхналогіямі, чым «першы свет» (заходнія індустрыяльныя дзяржавы і Японія) або «другі свет» (краіны сацыялістычнага лагера).

Дзяржавы «трэцяга свету» істотна адрозніваліся паміж сабой. Але ў іх была адна агульная задача — правядзенне мадэрнізацыі. Гэта прадугледжвала ліквідацыю




Дэкаланізацыя Афрыкі

Правообладатель Издательский центр БГУ




На мяжы 1950—1960-х гг. узнікла больш за чатыры дзясяткі незалежных дзяржаў, якіх раней не існавала. 1960 г. быў у далейшым названы Годам Афрыкі, бо тады незалежнасць атрымалі 17 афрыканскіх дзяржаў

каланіяльнай спадчыны і эканамічнай адсталасці. Большасць краін, што сталі на шлях развіцця, сталі членамі ААН, дзе яны часта аб'ядноўваліся і выступалі адзіным блокам. Многія з іх сталі адыгрываць прыкметную ролю ў глабальных палітычных і эканамічных працэсах.

**«Халодная вайна» і «трэці свет».** Стварэнне новых дзяржаў прыпала на перыяд «халоднай вайны». ЗША і СССР змагаліся за ўплыў у свеце, прапаноўваючы краінам, якія сталі на шлях развіцця, эканамічную і ваенную дапамогу. Звышдзяржавы імкнуліся распаўсюдзіць сваю ідэалогію і мадэль развіцця: капіталізм або сацыялізм. Шэраг новых дзяржаў аддалі перавагу сацыялізму галоўным чынам з той прычыны, што іх старыя каланіяльныя валадары былі капіталістамі. Іншыя дзяржавы прыцягвалі эканамічная магутнасць і матэрыяльны дабрабыт Захаду.

Многія маладыя дзяржавы адмовіліся далучацца да ваенных блокаў. Захоўваючы нейтралітэт, яны арганізоўвалі рэгулярныя сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў або міністраў замежных спраў, узгаднялі свае дзеянні ў міжнародных арганізацыях.Так у *1961 г.* канчаткова аформіўся *Рух недалучэння*. Асноўнай яго мэтай было аслабленне міжнароднай напружанасці і правядзенне выгаднай для краін, што сталі на шлях развіцця, эканамічнай палітыкі. Лідарам гэтага руху стала Індыя.

У краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі даволі часта ўспыхвалі лакальныя канфлікты. Іншым часам «халодная вайна» ператваралася ў сапраўдную. ЗША і СССР, як правіла, падтрымлівалі варожыя бакі. Выкарыстоўваючы такія канфлікты, звышдзяржавы ўскосна, а не адкрыта, ваявалі адна з адной. Яскравым прыкладам таго з'яўляюцца карэйская і в'етнамская войны. А адным з самых зацяжных і вострых канфліктаў стала араба-ізраільскае супрацьстаянне на Блізкім Усходзе. Важную ролю ва ўрэгуляванні гэтых канфліктаў адыгрывала ААН. Заканчэнне «халоднай вайны» не прывяло да ліквідацыі лакальных канфліктаў у нестабільных рэгіёнах.

№ 38

**Новыя дзяржавы ў пошуках стабільнасці.** Многія краіны, якія сталі на шлях развіцця, асабліва ў Афрыцы, сутыкнуліся з сур'ёзнымі праблемамі. Тут маладыя дзяржавы атрымалі ў спадчыну тэрыторыі, на якіх жылі людзі з рознай моўнай, рэлігійнай і этнічнай прыналежнасцю. Асобныя дзяржавы былі слаба падрыхтаваны да самакіравання: нярэдка багатая еўрапеізаваная эліта кантралявала і ўрад, і эканоміку. Пераважная большасць насельніцтва краін, якія сталі на шлях развіцця, заставалася беднай.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Асаблівае месца сярод дзяржаў займае Паўднёва-Афрыканскі Саюз (з 1961 г. — Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка (ПАР)). У 1948 г. тут на ўсеагульных выбарах перамагла Нацыянальная партыя. Яна правяла законы, якія абмяжоўвалі правы чарнаскурага насельніцтва. Гэта палітыка атрымала назву *апартэіду* і азначала, што карэннае насельніцтва было абавязана пражываць у спецыяльных рэзервацыях, займацца нізкааплатнай працай, а таксама пазбаўлялася ўсіх грамадзянскіх правоў. Канчатковай мэтай было стварэнне «Паўднёвай Афрыкі для белых». Толькі ў 1994 г. адбыліся ўсеагульныя дэмакратычныя выбары, прызнаныя міжнароднай супольнасцю, і перыяд апартэіду ў ПАР завяршыўся.




Расавая сегрэгацыя ў ПАР
(на лаўцы пазначана, што гэта месца
для еўрапейцаў)

Па меры нарастання праблем да ўлады ў новых дзяржавах прыходзілі ваенныя або аўтарытарныя лідары. Часта гэта былі тыя ж людзі, якія актыўна змагаліся за нацыянальнае вызваленне. Яны наводзілі парадак у краіне, усталёўваючы аднапартыйную дыктатуру і забараняючы іншыя палітычныя партыі.

У 1975 г., атрымаўшы перамогу ў грамадзянскай вайне, да ўлады ў Кампучыі прыйшлі «чырвоныя кхмеры» на чале з Пол Потам, якія ўзялі на ўзбраенне марксісцкую ідэалогію. Яны развязалі ў краіне генацыд супраць уласнага народа, а праз тры гады — вайну з В'етнамам. У 1979 г. в'етнамскія войскі скінулі рэжым «чырвоных кхмераў».

У шэрагу краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг. адбыліся дэмакратычныя пераўтварэнні. У выніку шматпартыйных выбараў былі скасаваны дыктатарскія рэжымы і аднапартыйныя сістэмы кіравання. Наступствы дэмакратычнага эксперымента аказаліся неадназначнымі з прычыны ўзнікнення эканамічных праблем і адсутнасці вопыту канстытуцыйнага кіравання ў гэтых дзяржавах.

**Перашкоды на шляху развіцця.** Некаторыя краіны, што сталі на шлях развіцця, напрыклад, Рэспубліка Карэя, Малайзія, Інданезія, Тайланд, Філіпіны, паспяхова мадэрнізавалі свае эканомікі. Іх нават назвалі «новыя індустрыяльныя краіны». Іншыя дзяржавы не дабіліся адчувальных вынікаў. Прычыны няўдач былі рознымі.

У многіх рэгіёнах геаграфічныя ўмовы сталі сур'ёзнай перашкодай на шляху прагрэсу. Асобныя дзяржавы, якія маюць невялікую тэрыторыю, адчувалі недахоп прыродных рэсурсаў, неабходных для самастойнага развіцця. Складаныя кліматычныя ўмовы, недахоп зямлі, прыдатнай для сельскай гаспадаркі, стваралі дадатковыя праблемы.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Рост насельніцтва стаў яшчэ адной сур'ёзнай перашкодай. Паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання і якасці харчавання прывяло да зніжэння смяротнасці і дэмаграфічнага выбуху, аднак адваротным бокам павелічэння колькасці насельніцтва стаў рост беднасці і галечы.

Эканамічныя адносіны, што ўсталяваліся ў эпоху імперыялізму, істотна не змяніліся і пасля 1945 г. Большасць новых краін захавалі залежнасць ад сваіх былых метраполій. Яны па-ранейшаму пастаўляюць сельскагаспадарчую прадукцыю і сыравіну індустрыяльнаму свету і маюць патрэбу ў заходніх прамысловых таварах, тэхналогіях і інвестыцыях. У многіх краінах, якія сталі на шлях развіцця, захавана вытворчасць аднаго пэўнага віду прадукцыі, напрыклад, цукру або какавы. Таму іх эканомікі знаходзяцца ў поўнай залежнасці ад попыту на міжнародным рынку. Большая частка прыродных рэсурсаў ідзе на выплату працэнтаў па запазычанасцях.

№ 39

Такім чынам, краіны, што сталі на шлях развіцця, апынуліся ў залежнасці ад розных відаў дапамогі з боку былых метраполій. Вялікабрытанія, Францыя і іншыя краіны Захаду праводзілі палітыку, накіраваную на захаванне свайго ўплыву ў былых калоніях новымі, больш гібкімі эканамічнымі метадамі. Гэта палітыка атрымала назву ***неакаланіялізму***.

Пасля атрымання незалежнасці многія краіны разлічвалі, што менавіта сацыялістычны шлях развіцця дапаможа ім хутка мадэрнізаваць эканоміку. Сваю эканамічную палітыку яны будавалі на ўзор Кітая або СССР, якія дабіліся хуткага індустрыяльнага росту. У 1950—1960-я гг. сацыялістычныя краіны, якія сталі на шлях развіцця, змаглі ажыццявіць пэўны прарыў. Аднак замацаваць гэты поспех не атрымалася. Пад ціскам Захаду ў 1980-я гг. краіны пачалі пераходзіць да рыначнай эканомікі. Распад СССР канчаткова паставіў кропку на сацыялістычнай арыентацыі краін, што сталі на шлях развіцця.

Вырашэнню сацыяльных праблем і эканамічнаму развіццю ў краінах Азіі і Афрыкі перашкаджалі грамадзянскія войны і іншыя канфлікты. Ваенныя дыктатары і аўтарытарныя кіраўнікі трацілі грошы на зброю, а не на адукацыю, жыллё або ахову здароўя. Сальвадор у Цэнтральнай Амерыцы, Ліван на Блізкім Усходзе, Камбоджа ў Паўднёва-Усходняй Азіі і Мазамбік у Афрыцы — вось няпоўны пералік краін, што сталі на шлях развіцця і асабліва пацярпелі ад унутраных канфліктаў і грамадзянскіх войнаў.

**1.** Растлумачце значэнне паняцця «дэкаланізацыя». Апішыце працэс дэкаланізацыі. Выкарыстайце картасхему на с. 205.
**2.** Чаму дзяржавы, якія вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, сталі называць краінамі «трэцяга свету»? З якімі праблемамі яны сутыкнуліся?
**3.** Як паўплывала на развіццё краін «трэцяга свету» «халодная вайна»? Назавіце асноўныя шляхі, па якіх пайшло развіццё вызваленых краін.
**4.** Чаму заходнія дзяржавы імкнуліся захаваць свой уплыў у былых калоніях? Якую назву атрымала гэта палітыка? У чым была яе сутнасць?

Правообладатель Издательский центр БГУ

5. Чаму ў вызваленых краінах актыўную ролю ў палітыцы адыгрываюць ваенныя і часта ўсталёўваюцца аўтарытарныя рэжымы? Прывядзіце прыклады.
6. Чаму новыя дзяржавы імкнуцца да стварэння міждзяржаўных арганізацый? Прывядзіце прыклады.

Як вы думаеце, чаму ў краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі цяжка прыжываецца дэмакратычная форма кіравання?

# § 40. Кітай у 1945—1978 гг.

*1. Калі была абвешчана Кітайская Савецкая Рэспубліка? 2. Якія палітычныя партыі змагаліся за ўладу ў Кітаі ў міжваенны перыяд? 3. Ахарактарызуйце становішча Кітая ў гады Другой сусветнай вайны.*

У гісторыі Кітая другой паловы XX — пачатку XXI ст. можна вылучыць два асноўныя перыяды. Першы перыяд (1949—1978) ахоплівае сацыялістычныя эксперыменты на мааісцкай аснове. Другі перыяд (з 1978 г.) адкрывае пераход КНР да рыначнай эканомікі — своеасаблівага варыянта перабудовы кітайскага грамадства.

**Утварэнне КНР.** У жніўні 1945 г. завяршылася вызваленне Кітая ад японскай акупацыі. Актыўны ўдзел у вызваленчай барацьбе ўзялі дзве найбуйнейшыя палітычныя сілы краіны — Гаміньдан і Камуністычная партыя Кітая (КПК).

Лідар Гаміньдана Чан Кайшы ўзначальваў урад Кітайскай Рэспублікі. Яго партыя выступала за развіццё эканомікі на аснове рыначных адносін і ўмацаванне сувязяў з заходнімі краінамі.

Камуністы на чале з Маа Цзэдунам першапачаткова кантралявалі невялікую тэрыторыю — так званы Асаблівы раён на поўначы краіны. Гэты раён быў шматгадовай базай Народна-вызваленчай арміі Кітая (НВАК). Да канца вайны НВАК кантралявала 19 «свабодных раёнаў» з плошчай каля 1 млн км$^2$ і насельніцтвам каля 100 млн чалавек. Колькасць КПК перасягнула мільён, партыя ператварылася ў сілу, з якой даводзілася лічыцца гаміньданаўскаму ўраду. Кітайскія камуністы атрымлівалі дапамогу ад Масквы — узбраенне і грошы. Гэта падтрымлівала іх імкненне да сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудовы грамадства паводле савецкай мадэлі.

СССР зрабіў вялікі ўнёсак у разгром японцаў на Далёкім Усходзе. Савецкія войскі нанеслі паражэнне Квантунскай арміі і часова акупавалі тэрыторыю Маньчжурыі. У жніўні 1945 г. паміж Савецкім Саюзам і гаміньданаўскім Кітаем быў заключаны Дагавор аб дружбе і саюзе. Гаміньдан і КПК пачалі перагаворы аб стварэнні кааліцыйнага ўрада. Аднак супярэчнасці паміж імі былі настолькі вострыя, што перамовы не завяршыліся поспехам.

У гэты час савецкі ўрад прыняў канчатковае рашэнне ў сваёй палітыцы адносна Кітая арыентавацца толькі на КПК. У красавіку 1946 г. Савецкі Саюз вывеў свае

Правообладатель Издательский центр БГУ